ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА. КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 36 (522) | Субота, 18 снежня 1982 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## СЁННЯ ЎСЕСАЮЗНЫ КАМУНІСТЫЧНЫ СУБОТНІК

Лічаныя дні застаюцца да знамянальнага і радаснага свята савецкіх людзей — 60-годдзя ўтварэння Саюза ССР. У кожным калектыве гэтай гістарычнай падзеі рыхтуюць дастойную сустрэчу. Ёй прысвячаецца і сённяшні Усесаюзны камуністычны суботнік. На яго выйдуць дзесяткі мільёнаў працоўных, студэнтаў, навучэнцаў і школьнікаў, каб парадаваць любімую Радзіму самаадданай працы на вытворчасці, будоўлях і ў іншых галінах народнай гаспадаркі.

Для забеспячэння рытмічнай і якаснай работы ў многіх калектывах працуюць у лік суботніка па графіку. З 15 снежня пачалася працоўная вахта «чырвонай суботы» і для студэнтаў матэматычнага факультэта. Яны вядуць земляныя работы на будаўніцтве 40-кватэрнага жылога дома па вуліцы Фрунзе. Матэматыкі групамі працуюць у першую змену, а ў другую выходзяць студэнты геалагічнага факультэта.

Аб'ект фізічнага факультэта — будуемы інтэрнат партыйных курсаў абкома КПБ. Тут студэнты пачалі працаваць з 16 снежня.

Асноўная маса студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта сёння будзе занята на добраўпарадкаванні універсітэцкіх карпусоў.

Ганаровы абавязак кожнага члена шматтысячнага універсітэцкага калектыву ў дзень камуністычнага суботніка паказаць узоры стараннай, самаадданай працы.

## ЛЕНІНСКАЙ ДРУЖБАЮ МОЦНЫЯ

16 снежня ў Мінску, у па-святочнаму ўпрыгожанай зале Дзяржаўнага ордэна Леніна акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета БССР адбылося ўрачыстае пасяджэнне Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі і Вярхоўнага Савета Беларускай ССР, прысвечанае 60-годдзю ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік.

У прэзідыуме — кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі Ц. Я. Кісялёў, намеснік Старшыні Савета Міністраў СССР З. Н. Нурыеў, Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР І. Я. Палякоў, Старшыня Савета Міністраў БССР А. Н. Аксёнаў, члены і кандыдаты ў члены Бюро ЦК КПБ.

Разам з імі знаходзіліся члены Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, намеснікі Старшыні Савета Міністраў БССР, першыя сакратары абкомаў і Мінскага гаркома КПБ, загадчыкі аддзелаў ЦК КПБ, военачальнікі, ветэраны партыі, удзельнікі рэвалюцыі, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, сацыялістычнага будаўніцтва, перадавікі і наватары вытворчасці, дзеячы навукі і культуры, лётчыкі-касманаўты СССР П. І. Клімук і У. В. Кавалёнак.

Урачыстае пасяджэнне адкрыў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КПБ Ц. Я. Кісялёў.

Пад бурныя апладысменты выбіраецца Ганаровы прэзідыум урачыстага пасяджэння ў саставе Палітбюро Цэнтральнага Камітэта КПСС.

Ц. Я. Кісялёў дае слова З. Н. Нурыеву.

З. Н. Нурыеў выступіў на ўрачыстым пасяджэнні з прамовай і ўручыў кіраўнікам рэспублікі, прадстаўнікам працоўных калектываў Чырвоны сцяг ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.

Ц. Я. Кісялёў запэўніў Цэнтральны Камітэт КПСС, Савецкі ўрад у тым, што рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя Савецкай Беларусі будуць і ў далейшым уносіць дастойны ўклад у справу ўмацавання эканамічнай і абароннай магутнасці любімай Радзімы, працаваць яшчэ лепш, эфектыўней, паўней выкарыстоўваць рэзервы, свята захоўваць вялікую свяшчэнную дружбу савецкіх народаў.

Затым з дакладам аб 60-годдзі Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік атрымлівае кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар Цэнтральнага Камітэта КПБ Ц. Я. Кісялёў.

Удзельнікі ўрачыстага пасяджэння накіравалі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР, Савету Міністраў СССР.

(БЕЛТА).

## ЮБІЛЕЙНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

У актавай зале універсітэта адбылася навукова-тэарэтычная канферэнцыя выкладчыкаў і студэнтаў геалагічнага факультэта, прысвечаная 60-годдзю ўтварэння СССР.

Уступным словам канферэнцыю адкрыла сакратар партыйнага бюро геафака Ж. А. Герасімава.

З дакладам «Сацыяльна-эканамічныя вынікі развіцця СССР за 60 гадоў» на канферэнцыі выступіла кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафедры палітэканоміі Т. А. Мальгіна.

Загадчык кафедры мінералогіі, петраграфіі і геахіміі прафесар В. А. Вахрушаў расказаў у сваім дакладзе аб тым, якіх поспехаў дасягнула савецкая геалогія за 60 гадоў існавання СССР.

Для ўдзельнікаў канферэнцыі быў дадзены канцэрт. З ім выступілі навучэнцы музычнага вучылішча імя Сакалоўскага.

**Т. ГАРАНІНА,**
**намеснік сакратара партбюро геалагічнага факультэта па ідэалагічнай рабоце, дацэнт кафедры філасофіі.**

## З СЯБРОЎСКІМ ВІЗІТАМ

З 5 па 9 снежня ў рамках абмену лектарскімі групамі Гомельскага і Жытомірскага абласных праўленняў таварыства «Веды», прысвечанаму 60-годдзю ўтварэння СССР, ва ўкраінскіх сяброў пабывалі кандыдат эканамічных навук, дацэнт кафедры палітэканоміі Я. П. Кульбацкі і кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі Г. С. Еўдакіменка.

Дацэнт Я. П. Кульбацкі выступіў з лекцыяй «Эканоміка БССР за 60 гадоў» перад працаўнікамі калгаса «Ганаўка» Андрушоўскага раёна, рабочымі і інжынерна-тэхнічнымі работнікамі Андрушоўскага цукровага завода, перад калектывам мясцовага аддзялення сувязі, выкладчыкамі і студэнтамі Жытомірскага сельскагаспадарчага і педагагічнага інстытутаў, рабочымі завода «Хімвалакно» і станкабудаўнічага завода.

Дацэнт Г. С. Еўдакіменка з лекцыяй «Савецкая Беларусь у адзінай сям'і братніх народаў» выступіў перад навучэнцамі і студэнтамі Жытомірскага ПТВ-6, філіяла Кіеўскага політэхнічнага інстытута, тэхнікума механізацыі апрацоўкі драўніны, андрушоўскай СШ № 1, перад рабочымі і інжынерна-тэхнічнымі работнікі камбікормавага і спіртавога заводаў, аўтакалоны.

Усюды нашы лектары адчувалі выключную гасціннасць. Іх пазнаёмілі з жыццём працоўных Андрушоўскага раёна і Жытоміршчыны ў цэлым. Адбыліся сустрэчы з кіраўнікамі прадпрыемстваў і навучальных устаноў.

## КУРСАМ XXVI З'ЕЗДА КПСС

XXVI з'езд КПСС, абмяркоўваючы задачы далейшага развіцця краіны, звярнуў асаблівую ўвагу на спецыфіку развіцця ўсяго супрацоўніцтва нацый СССР на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва.

Характэрнай асаблівасцю для Саюза ССР у 70-ыя гады з'явіліся буйныя змяненні ў размяшчэнні прадукцыйных сіл. У адпаведнасці з рашэннямі XXIV і XXV з'ездаў КПСС у краіне працягваўся працэс фарміравання тэрытарыяльна-вытворчых комплексаў галоўным чынам ва ўсходніх раёнах краіны — на Урале, у Сібіры, на Далёкім Усходзе, у Казахстане, і Таджыкістане. Дастаткова адзначыць, што з 1970 па 1980 год здабыча нафты (уключаючы газавы кандэнсат) на паўночным захадзе Сібіры павялічылася з 32 да 312 млн. тон, а газу — з 9,5 да 156 млрд. куб. м.

Вызначаючы актуальныя народнагаспадарчыя праблемы на 80-я гады, у тым ліку на XI пяцігодку, XXVI з'езд КПСС улічваў, што ў гэты перыяд будзе дзейнічаць шэраг фактараў, якія ўскладняць эканамічнае развіццё краіны. Гэта — скарачэнне прыросту працоўных рэсурсаў, павелічэнне затрат у сувязі з асваеннем Усходу і Поўначы, павелічэнне расходаў на ахову акаляючага асяроддзя, наяўнасць значнай колькасці старых прадпрыемстваў, што патрабуюць карэннай перабудовы, неадпаведнасць сённяшняму дню дарог, транспарту, сувязі. Напрыклад, у 10-й пяцігодцы папаўненне працоўных рэсурсаў складала 11 млн. чалавек, а ў 11-ай яно не перавысіць 3,8 млн. чалавек, а ў 12-ай зменшыцца яшчэ прыкладна на 1 млн. Для прыросту сыравіны на адзін рубель у здабываючых галінах гаспадаркі ў 9-ай пяігодцы неабходна было ўкласці два рублі капіталаўкладанняў, у 10-ай — ужо 4, а ў бягучай пяцігодцы — 5—6 рублёў. Яшчэ адзін прыклад. У Сібіры да пачатку адзінаццатай пяцігодкі залягала прыкладна 80 працэнтаў разведаных прыродных багаццяў краіны. І адначасова тут жыве толькі 8 працэнтаў насельніцтва СССР, сканцэнтравана ўсяго толькі адна дзесятая вытворчых фондаў.

Улічваючы дзеянне адзначаных фактараў, XXVI з'езд КПСС вызначыў цэлы шэраг буйных народнагаспадарчых задач. У прыватнасці, неабходна асвоіць і паставіць на службу народу паліўна-энергетычныя і іншыя багацці Поўначы, Сібіры і Далёкага Усходу (асваенне Урэнгойскага месцанараджэння газу, выкарыстанне танных вугляў Камска-Ачынскага і Экібастузскага басейнаў), закончыць будаўніцтва БАМа і прыступіць да асваення багаццяў гэтай зоны, ажыццявіць распрацоўку Нечарназем'я, вырашыць шэраг іншых задач. Гэта магчыма толькі на аснове агульных намаганняў, сумеснай працы людзей усіх нацый і народнасцей краіны, удасканальвання прынцыпа матэрыяльнай зацікаўленасці, выраўнівання жыллёвых і культурна-бытавых умоў з цэнтральнымі раёнамі краіны.

Вырашэнне гэтых грандыёзных задач будзе абавязкова суправаджацца буйнымі перамяшчэннямі рабочай сілы ў раёны асваення прыродных багаццяў і будаўніцтва вытворчых гігантаў і, натуральна, павінна прывесці да з'яўлення новых працэсаў і праблем у сферы нацыянальных адносін. Як паказалі дадзеныя Усесаюзнага перапісу насельніцтва СССР 1979 года, у некаторых рэспубліках значна павялічылася колькасць грамадзян некарэнных нацыянальнасцей. Напрыклад, у Казахстане і Кіргізіі яна складае больш палавіны. Гэта характэрна і для нашых аўтаномных рэспублік, што ўлічваецца пры выбарах у Саветы народных дэпутатаў, пры ажыццяўленні кадравай палітыкі. У Вярхоўным Савеце СССР цяпер прадстаўлена 61 нацыя нашай краіны, у Вярхоўных Саветах саюзных рэспублік,—66, у аўтаномных рэспубліках — 52, у мясцовых Саветах народных дэпутатаў — усе нацыі, народнасці і нацыянальныя групы.

XXVI з'езд заклікаў паважаць нацыянальныя вартасці савецкага чалавека і ў той жа час выступіў супраць любых праяў шавінізму і нацыяналізму.

«Свяшчэнны абавязак партыі, — гаварылася ў Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXVI з'езду партыі, — выхоўваць працоўных у духу савецкага патрыятызму і сацыялістычнага інтэрнацыяналізму, гордага пачуцця прыналежнасці да адзінай вялікай Савецкай Радзімы».

Задачы, пастаўленыя на 11-ю пяцігодку і на ўвесь перыяд 80-ых гадоў, адказваюць жыццёвым інтарэсам усіх народаў СССР. Вызначаная з'ездам шырокая праграма далейшага павышэння дабрабыту савецкіх людзей ахоплівае іх патрэбы ў жыллі, паляпшэнні ўмоў працы і быту, культуры і адпачынку. Адной са складаемых частак гэтай праграмы з'яўляецца прынятая на майскім (1982 г.) Пленуме ЦК КПСС Харчовай праграмы і адобраных пастаноў, накіраваных на яе рэалізацыю. Дакументы, прынятыя майскім і лістападаўскім (1982 г.) Пленумамі ЦК КПСС — яркае сведчанне клопатаў партыі аб павышэнні матэрыяльнага і культурнага ўзроўню жыцця народа.

Генеральны сакратар ЦК КПСС таварыш Ю. У. Андропаў у сваёй прамове на лістападаўскім Пленуме ЦК КПСС, характарызуючы задачы партыі і народа на 1983 год і на бліжэйшую перспектыву, звярнуў асаблівую ўвагу на пытанні інтэнсіфікацыі і павышэння эфектыўнасці грамадскай вытворчасці, значнага паляпшэння капітальнага будаўніцтва, узмацнення рэжыму эканоміі, умацавання дзяржаўнай, працоўнай і выканаўчай дысцыпліны, устанаўлення строгага кантролю за выкананнем прынятых рашэнняў. Пры гэтым Ю. У. Андропаў падкрэсліў, што цэнтральнае месца ў нашых планах займаюць меры, звязаныя з вырашэннем Харчовай праграмы.

У росквіце творчых сіл сустракае магутны Саюз Савецкіх рэспублік сваё 60-годдзе. Поўная маладой энергіі наша вялікая Айчына стаіць на парозе новых здзяйсненняў. І мы цвёрда ведаем, што дасягнем усяго, да чаго імкнемся. Гарантыяй таму — наша нязменная вернасць вечна жывому ленінскаму вучэнню, мудрае кіраўніцтва слаўнай ленінскай партыі — вядучай і накіроўваючай сілы інтэрнацыянальнага саюза савецкіх народаў.

**Г. ЕЎДАКІМЕНКА,**
**дацэнт кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі.**
**Я. СЕМЯНЧУК,**
**дацэнт кафедры гісторыі КПСС.**

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі універсітэта, кафедра заалогіі і аховы прыроды горача віншуюць загадчыка вучэбна-кансультацыйнага пункта пры ГДУ РОДЗІКАВА Уладзіміра Пятровіча з выпадку зацвярджэння яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата біялагічных навук.**

*Мая Радзіма—СССР*

# У СЭРЦАХ ЗАСТАЕЦЦА НАЗАЎСЁДЫ

Нядаўна камітэт камсамола універсітэта арганізаваў паездку па гераічнай беларускай зямлі для пяцікурснікаў фізічнага факультэта — пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва на фізфаку і для лепшых слухачоў народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання, камсамольскага актыву біялагічнага факультэта. На поездзе «Дружба» разам са студэнтамі ГДУ былі і сябры з Манголіі.

Звонкія песні пад гітару, цёплая задушэўная гутарка з сябрамі значна скарацілі адлегласць да горада над Бугам, куды ўзяў кірунак поезд «Дружба». Наперадзе ў студэнтаў былі два дні цікавых сустрэч з гарадамі Мінск і Брэст, з іх гісторыяй, архітэктурай.

Цяпер, калі ўдзельнікі захапляючага падарожжа вярнуліся ва універсітэт, яны дзеляцца сваімі ўражаннямі пра гэту незабыўную паездку.

**— Што ў цэлым можаце сказаць пра паездку на поездзе «Дружба»?**

**Наталля СКАКУН, пяцікурсніца фізічнага факультэта:** — Імклівы бег часу. Хутка мы закончым універсітэт, раз'едземся ў розныя куткі рэспублікі. І аднымі з самых памятных дзён, праведзеных разам з аднадурснікамі, згуртаваўшых нас яшчэ мацней, будуць дні паездкі ў гарады Брэст і Мінск.

**Нона ДЖЫОЕВА, студэнтка 2-га курса матэматычнага факультэта:** — Гаварыць аб уражаннях паездкі можна шмат, але з асаблівай цеплынёй заўсёды буду ўспамінаць цеснае ўтульнае купэ, твары сяброў.

**— Першы прыпынак быў ў горадзе-героі Брэсце. Вашы ўражанні аб ім?**

**Эніта ЯРОХІНА, студэнтка 5-га курса фізфака:** — Знаёмства з горадам пачалося з агляднай экскурсіі. Праязджаючы па вуліцах Брэста, знаёмячыся з яго архітэктурай, мяне не пакідала цёплае, святое пачуццё да горада, крэпасць якога першая прыняла ўдар ворага.

Наведанне гісторыка-архітэктурнага музея адкрыла новыя старонкі гісторыі горада. Калі мы праходзілі па залах музея, нам здавалася, што паступова, пласт за пластом здымаем зямлю з самага заходняга горада Беларусі, каб убачыць яго аснову.

**Наталля СЫЧОВА, пяцікурсніца фізічнага факультэта:** — Вельмі моцнае ўражанне аб магутнасці нашай Радзімы, яе бязмежных прасторах зрабіў на мяне ўказальнік: бетонны слуп з сінім металічным вугалком, на адным баку якога — лічба «0», на другім — «1054». Менавіта з гэтага нуля бярэ адлік наша Радзіма. 1054 кіламетр ад гэтага белага слупа да сталіцы краіны Кастрычніка. Затаіўшы дыханне, глядзелі мы лічбы, якія азначалі так многа!

**— Паездка ў г. Брэст уключыла і наведанне Брэсцкай крэпасці-героя.**

**Ірына САЎЧАНКА, студэнтка 5-га курса фізфака:** — Усхваляваныя, ступалі мы на свяшчэнную зямлю легендарнай Брэсцкай крэпасці. Ідзём па бетонных плітах, кожны наш крок адлічвае метраном, як бы набліжаючы нас да той раніцы 22 чэрвеня 1941 года. І як пацвярджэнне незабыўнаму мінуламу гучыць голас Ю. Левітана.

Галоўны ўваход у форме пяціканечнай зоркі, высечаный у бетонным блоку, дарожка з чырвонага пластабетона — сімвал пралітай крыві, скульптурная кампазіцыя «Смага», і галоўны манумент — усё тут нагадвае аб той страшнай вайне.

**Ніна МАКСІМАВА, пяцікурсніца фізічнага факультэта:** — Цясней прытуліўшыся, адчуваючы плячо адзін аднаго, увайшлі мы на тэрыторыю цытадэлі. Увайшлі і сталі не гледачамі, а, здавалася, удзельнікамі абароны і сведкамі гераізму савецкіх воінаў. Валявы, мужны твар з нянавісцю да фашыстаў і гатоўнасцю цаной жыцця не прапусціць ворага далей сцен крэпасці жывымі вачыма глядзеў на нас з трыццаціметровай вышыні.

**Таццяна АЛЬЯНКОВА, студэнтка 3-га курса матфака:** — Гледзячы на гэты твар, я падумала: «Няма такой сілы на зямлі, якая б магла паставіць наш народ на калені, прымусіць яго скарыцца, аддаць сваю свабоду і незалежнасць. За іх мы гатовы, калі спатрэбіцца, заплаціць нават сваім жыццём!»

Мы слухалі расказ экскурсавода пра абаронцаў крэпасці. Усе, хто мог трымаць у руках зброю — байцы, жанчыны, дзеці — больш месяца стрымлівалі націск ворага. Уразіў нас подзвіг Пеці Васільева — выхаванца музычнага ўзвода. Ён прабраўся на вышкі афіцэрскага клуба да змоўкшага кулямёта і вёў агонь да таго часу, пакуль не быў цяжка паранены.

Яшчэ больш велічна выглядае Брэсцкая крэпасць вечарам, калі запальваюцца агні. Быццам языкі полымя ахопліваюць каменныя сцены цытадэлі.

Пакідаючы тэрыторыю крэпасці, мы чулі ўсё той жа стук метранома, які як бы звязваў два пакаленні: 30—40 гадоў, якое здзейсніла гераічны подзвіг, і 70—80 гадоў, якое прыходзіць пакланіцца яму і назаўсёды захаваць у сэрцы ўдзячнасць мужнасці, нескаронасці нашага народа.

**— Наперадзе была сустрэча са сталіцай рэспублікі — г. Мінскам.**

**Ю. КУЛАЖАНКА, студэнт 2-га курса матэматычнага факультэта:** — Мы сказалі: «Да пабачэння, Брэст!», каб наступнай раніцай сказаць: «Добры



**НА ЗДЫМКУ:** удзельнікі экскурсіі ў Брэсцкай крэпасці.
Фота **В. Крыжыўца.**

# ТРЫВАЛЫЯ КАНТАКТЫ

**Маладыя супрацоўнікі з кафедры тэарэтычнай фізікі нашага універсітэта В. Капшай і А. Лінкевіч праходзілі навуковую стажыроўку ў Лабараторыі тэарэтычнай фізікі Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў у г. Дубна. У адным з нумароў газеты інстытута «Наука, содружество, прогресс» быў змешчаны іх артыкул аб супрацоўніцтве вучоных інстытута з гомельскімі фізікамі-тэарэтыкамі. Гэты артыкул мы прапануем вашай увазе.**

У апошнія гады паспяхова развіваецца супрацоўніцтва дзвюх тэарэтычных школ: акадэміка М. М. Багалюбава і беларускай школы акадэміка АН БССР Ф. І. Фёдарава. Яркім увасабленнем сувязей, якія ўвесь час пашыраюцца, з'явілася правядзенне па іх ініцыятыве ў г. Гомелі міжнародных школ маладых вучоных па фізіцы высокіх энергій і рэлятывісцкай ядзернай фізіцы. Першая гомельская школа адбылася летам 1971 года ў сасновым бары на беразе ракі Сож. У трэцяй школе (1979 г.) у якасці лектараў прынялі ўдзел буйнейшыя вучоныя фізікі нашай краіны.

Значную дапамогу і падтрымку ў правядзенні школ, у разгортванні даследаванняў па фізіцы элементарных часцінак нязменна аказвалі віцэ-прэзідэнт АН БССР рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта У. А. Белы, дырэктар Інстытута фізікі АН БССР акадэмік АН БССР Б. І. Сцяпанаў, намеснік дырэктара член-карэспандэнт АН БССР В. С. Буракоў, рэктар нашага універсітэта акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць і інш. Актыўны ўдзел ў арганізацыі і правядзенні школ прымалі беларускія тэарэтыкі А. А. Богуш, Л. Г. Мароз, Л. М. Тамільчык, У. М. Старыкаў (цяпер загадчык праблемнай навукова-даследчай лабараторыі фізіка-хімічных працэсаў трэння ГДУ) і загадчык кафедры тэарэтычнай фізікі нашага універсітэта М. В. Максіменка.

Правядзенне гомельскіх школ мела вялікае значэнне для развіцця ў Беларусі тэарэтычнай і эксперыментальнай фізікі высокіх энергій. Кантакты паміж вучонымі Дубны, Мінска, Гомеля, зразумела, не абмяжоўваюцца правядзеннем школ для маладых вучоных. Дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву з Лабараторыяй ядзерных праблем Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў, у Мінску і Гомелі створан цэнтр па апрацоўцы фільмавай інфармацыі, праводзяцца пашыраныя сумесныя эксперыментальныя даследаванні. Вялікую падтрымку ў развіцці гэтага супрацоўніцтва і разгортванне эксперыментальных і тэарэтычных даследаванняў па фізіцы высокіх энергій ў Гомелі аказвае рэктар ГДУ акадэмік АН БССР Б. В. Бокуць.

У апошнія гады паспяхова развіваецца плённае супрацоўніцтва Лабараторыі тэарэтычнай фізікі Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў з тэарэтыкамі г. Гомеля. На кафедры тэарэтычнай фізікі універсітэта і на кафедры вышэйшай матэматыкі політэхнічнага інстытута праводзяцца сумесныя з ЛТФ АІЯД даследаванні ў галіне апісання ўзаемадзеянняў элементарных часцінак на аснове рэлятывісцкіх састаўных мадэляў. Актыўны ўдзел у гэтых даследаваннях прымаюць спецыялісты, якія прайшлі школу навукова-даследчай работы ў ЛТФ пад кіраўніцтвам М. Б. Скачкова, С. В. Галаскокава, В. Б. Бяляева. Амаль штогод у сценах Лабараторыі тэарэтычнай фізікі выконваюць дыпломныя работы лепшыя студэнты і праходзяць навуковую стажыроўку маладыя супрацоўнікі ГДУ.

Супрацоўніцтва з гомельскімі тэарэтыкамі садзейнічае выкананню даследаванняў, якія ўваходзяць у праблемна-тэматычны план ЛТФ. Кожны год выходзіць значная колькасць сумесных публікацый. Важна адзначыць, што наша супрацоўніцтва знаходзіцца пад пастаяннай увагай і падтрымліваецца буйнейшымі беларускімі вучонымі, кіраўнікамі АН БССР і Мінвузам БССР, а таксама — кіраўніцтвам і вядучымі спецыялістамі ЛТФ АІЯД.

Вопыт сумесных даследаванняў і правядзення міжнародных школ дае падставы спадзявацца, што супрацоўніцтва прынясе новыя навуковыя вынікі, будзе і ў далейшым садзейнічаць развіццю тэарэтычнай фізікі ў Беларусі.

**В. КАПШАЙ,**
**кандыдат фізіка-матэматычных навук,**
**А. ЛІНКЕВІЧ,**
**асістэнт кафедры тэарэтычнай фізікі,**
**М. СКАЧКОЎ,**
**кандыдат фізіка-матэматычных навук.**

## У ШКОЛЕ КАМСАМОЛЬСКАГА АКТЫВУ

Адбыліся чарговыя заняткі ў школе камсамольскага актыву універсітэта. На іх прысутнічалі сакратары і члены камсамольскіх бюро факультэтаў, курсаў і груп, члены камітэта камсамола ГДУ. З лекцыяй «Формы і метады ідэалагічнай работы ў камсамольскіх арганізацыях» выступіў дэлегат XIX з'езда ВЛКСМ сакратар Гомельскага абкома ЛКСМБ В. Мацюк.

*Мы-інтэрнацыяналісты*

# ТАКАЯ ГАСЦІННАЯ

«Студэнцкі свет-82» — так называўся традыцыйны інтэрзлёт, які праходзіў нядаўна ў Чарнавіцкім дзяржаўным універсітэце. Дванаццаць дэлегацый з пяці саюзных рэспублік сабраліся на гэта свята маладосці. У старажытны горад Чарнаўцы — абласны цэнтр савецкай Букавіны — ездзілі члены КІДа «Саюз» нашага універсітэта. Цёпла і сардэчна сустрэлі нас гаспадары — студэнты ЧДУ. У дружалюбнай абстаноўцы прайшоў першы вечар на ўкраінскай зямлі. Нам прыемна было сустрэць тут сваіх даўніх знаёмых — членаў Клубаў інтэрнацыянальнай дружбы малдаўскага горада Бельцы, Бранскага і Херсонскага педагагічных інстытутаў, Яраслаўскага універсітэта. Адбыліся і новыя знаёмствы — са студэнтамі Махачкалінскага універсітэта, Валагодскага педінстытута, будучымі медыкамі з г. Цалінаграда.

Усім запомніцца мітынг салідарнасці, пасадка алеі дружбы. Зашумяць зялёным лісцем тополі, пасаджаныя дэлегатамі Беларусі і Малдавіі, Украіны і Казахстана, стануць сімвалам непарушнай дружбы народаў нашай Радзімы.

...У чытальнай зале студэнцкага гарадка сабраліся дэлегаты на практычную канферэнцыю, каб падзяліцца вопытам работы, намеціць планы на будучае. «Мы — маладыя! Справа міру на Зямлі — у нашых руках! Не дадзім узарваць планету!» — пад такімі лозунгамі вядзецца работа ў КІДах, дэлегацыі якіх прыехалі ў г. Чарнаўцы. Члены секцыі садзейнічання савецкаму Фонду міру Херсонскага КІДа «Мерыдыян» расказалі аб вопыце правядзення ў інстытуце кніжных кірмашоў салідарнасці. Аднадушна была падтрымана ўдзельнікамі канферэнцыі ініцыятыва Цалінаградскага медыцынскага інстытута аб арганізацыі будаўнічага атрада інтэрклубаўцаў, месцам дыслакацыі якога наступным летам стане Казахстан.

Клубы інтэрнацыянальнай дружбы краіны, адзначалася на канферэнцыі, прымаюць актыўны ўдзел у акцыях салідарнасці, збіраюць кнігі для дзіцячых дамоў, афармляюць альбомы да 60-годдзя ўтварэння СССР, праводзяць сустрэчы за круглым сталом «Сёння ў свеце» і інш. Гэта сапраўды вельмі патрэбная і важная справа. Клубы інтэрнацыянальнай дружбы ёсць цяпер у кожнай школе, кожным тэхнікуме, ВНУ. І гэтым школьнікі, студэнты ўносяць свой пасільны ўклад у справу ўмацавання міру.

Праграма фестывалю ўключала таксама знаёмства з музеям гісторыі Чарнавіцкага дзяржаўнага універсітэта, экскурсію па ЧДУ.

З пачуццём гонару расказвалі гасцям пра старэйшую на Украіне ВНУ. Універсітэт ў Чарнаўцах быў адкрыты ў 1875 годзе. Спачатку тут было толькі тры факультэты: багаслоўскі, філасофскі і юрыдычны. Навучанне вялося на нямецкай мове. У 1900 годзе тут вучылася толькі 35 студэнтаў-украінцаў. Яшчэ больш суровы, амаль казарменны рэжым, панаваў ва універсітэце пасля захопу Паўночнай Букавіны каралеўскай Румыніяй. У 1920 годзе ВНУ была аб'яўлена румынскай. Кафедру ўкраінскай літаратуры ліквідавалі зусім. Але ніякія рэпрэсіі не змаглі прымусіць студэнтаў адмовіцца ад удзелу ў рэвалюцыйна-вызваленчым руху. Пасля ўз'яднання Паўночнай Букавіны з Савецкай Украінай Чарнавіцкі універсітэт непазнавальна змяніўся. Цяпер на яго 11 факультэтах займаецца звыш 10 тысяч студэнтаў. У 1975 годзе ў сувязі са 100-годдзем, ЧДУ быў узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

дзень, Мінск, свяшчэнная зямля Хатыні і Кургана Славы!» Мы ўпершыню наведалі мемарыяльны комплекс Хатынь. Тое, што ўбачылі там, уразіла нас да глыбіні душы.

**Ірына САЎЧАНКА, пяцікурсніца фізфака:** — З кожным кіламетрам, які набліжаў нас да Хатыні, станавілася ўсё больш трывожна. Як гэта страшна і жудасна — ехаць у вёску, якой няма! На месцы кожнага з 26 згарэўшых дамоў складзены з бетонных балак ніжнія вянцы зрубаў. Няма дамоў, дзе раней чуваць былі дзіцячы смех, песні. — Цяпер тут — сумны звон.

**Святлана КУРАЧКІНА, студэнтка 5-га курса фізфака:** — 26 званоў... Гэта — хатынскі набат, які расказвае свету аб трагедыі беларускай вёскі, спявае гімн нескаронаму чалавеку, які ўстаў жывым з агню.

**— Кожны метр беларускай зямлі — гэта метр свяшчэннай, легендарнай зямлі. І пасля наведання хатынскага мемарыяла студэнтаў чакаў Курган Славы.**

**Ю. КУЛАЖАНКА, другакурснік матэматычнага факультэта:** —Як сімвал вечнай славы воінам-вызваліцелям падняўся на 21-м кіламетры Маскоўскай шашы Курган Славы. Тут, на кургане, змяшалася зямля, прывезеная з гарадоў-герояў, з Брэсцкай крэпасці, вёсак, якія навечна праславіліся ратнымі і працоўнымі подзвігамі, легендарная зямля легендарных людзей.

**—Якія ўражанні засталіся ў вас пасля знаёмства з нашай сталіцай?**

**Алена УСЦІЛОЎСКАЯ, першакурсніца матфака:** — Калі пад'язджалі да горада, не магла не залюбавацца маляўнічымі краявідамі: узгоркі, бярозавыя гаі, вечназялёныя ёлкі. І мне падумалася міжволі: «На такой прыгожай зямлі жылі і жывуць людзі, прыгожыя сваімі гераічнымі подзвігамі, працоўнымі здзяйсненнямі».

**У Мінску я была ўпершыню.** На азнаямленчай экскурсіі па гораду больш за ўсё ўражвала яго архітэктура.

**— Што яшчэ запамяталася з паездкі?**

**Алена ФРЫДМАН, першакурсніца матфака:** — У Брэсцкім аблдрамтэатры мы паглядзелі камедыю Вампілава «Развітанне ў чэрвені». Якімі блізкімі для кожнага з нас былі яе героі — студэнты! А ў Мінску нам удалося паглядзець у тэатры оперы і балета балет А. Пятрова «Утварэнне свету».

**Таццяна АЛЬЯНКОВА:** Я ніколі не думала, што ў танцы можна сказаць так многа, выразіць столькі пачуццяў!

Хачу падзякаваць усім, хто арганізаваў паездку: сакратару камітэта камсамола С. А. Аўсеенку, рэктару народнага універсітэта маральна-эстэтычнага выхавання Т. П. Гаранінай, яго прарэктару Г. І. Міцкевіч, Я. У. Аксюцік.

Да гэтых слоў удзячнасці далучаюцца ўсе студэнты — удзельнікі паездкі на поездзе «Дружба». Яны дзякуюць за такі вялікі духоўны падарунак.

**Гутарку правяла і запісала ўдзельніца паездкі, студэнтка 5-га курса фізфака Наталля САМУИЛІК.**

# ДЭПУТАЦКАЯ ГРУПА— У ІНТЭРНАЦЕ

На гэтым тыдні ў аўторак у інтэрнаце № 4 адбылася сустрэча студэнтаў з дэпутацкай групай. У сваім выступленні дэпутат абласнога Савета народных дэпутатаў акадэмік АН БССР рэктар універсітэта Б. В. Бокуць расказаў аб дасягненнях, з якімі універсітэцкі калектыў сустракае слаўнае 60-годдзе ўтварэння СССР, аб далейшым развіцці ГДУ і яго праблемах.

Сакратар Цэнтральнага РК КПБ, дэпутат раённага Савета народных дэпутатаў В. І. Чэпелаў завастрыў увагу прысутных на ўсямерным ўзмацненні дысцыпліны ў шырокім сэнсе яе разумення, паляпшэнні наглядная агітацыі.

На сустрэчы выступіла таксама старшыня студэнцкага прафкома Н. І. Колтышава.

Разам з выступаючымі на шматлікія пытанні адказвалі сакратар парткома М. І. Старавойтаў, прарэктар па АГР У. А. Шаўчэнка, адміністрацыйныя работнікі студэнцкай сталовай.

На сустрэчы прысутнічалі, дэпутат раённага Савета народных дэпутатаў, сакратар камітэта ЛКСМБ эканамічнага факультэта В. І. Жосткін, намеснік дэкана М. В. Герасімчык і намеснік сакратара партбюро па ідэалагічнай рабоце эканомфака Я. П. Кульбацкі.

**Г. КОТАЎ, старшы куратар эканамічнага факультэта па інтэрнату № 4.**

*Нашы юбіляры*

# ПРАФЕСАРУ М. І. РУБЦОВУ— 60 ГАДОЎ



Цэнтральнай фігурай вучэбна-выхаваўчага працэсу ў кожнай ВНУ з'яўляецца выкладчык-лектар, умелы і ўважлівы настаўнік студэнцкай моладзі. Гэтымі якасцямі ў поўнай меры валодае доктар філасофскіх навук, прафесар кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі нашага універсітэта Мікалай Іванавіч Рубцоў, якому ўчора споўнілася 60 гадоў. У жыцці гэтага чалавека, як і многіх яго равеснікаў, адлюстраваліся асноўныя этапы станаўлення і развіцця нашай краіны. І знамянальна, што свой юбілей ён адзначае напярэдадні слаўнага юбілею СССР.

Нарадзіўся М. І. Рубцоў у сялянскай сям'і ў с. Чарнавокава Клімаўскага раёна Бранскай вобласці. Пасля заканчэння сямігадовай школы працаваў у калгасе, а затым паступіў у Данецкі горны тэхнікум. Аднак спецыялістам горнай справы яму не давялося стаць. У яго далейшы лёс унесла свае карэктывы вайна. У жніўні 1941 года ён становіцца курсантам пяхотнага вучылішча, а ўжо праз год малады лейтэнант Рубцоў — камандзір стралковай роты, удзельнічае ў баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў на Сталінградскім фронце. Цяжкае раненне на некаторы час вырвала адважнага воіна з радоў абаронцаў Радзімы.

Пасля выздараўлення ў шпіталі — новыя франтавыя дарогі. М. І. Рубцоў — начальнік штаба гвардзейскага стралковага палка, у складзе войск І Прыбалтыйскага фронту ўдзельнічае ў пераможных наступленнях Чырвонай Арміі. Ордэн «Чырвонай Зоркі» і медалі — адзнака яго баявых заслуг.

Пасля другога цяжкага ранення восенню 1944 года М. І. Рубцоў ужо не вярнуўся ў строй сваіх баявых сяброў. Пасля лячэння ён накіроўваецца на камсамольскую работу — працуе інструктарам Кіраўскага ГК ВЛКСМ. Аднак Мікалая Іванавіча не пакідаюць думкі аб вучобе. І ў 1947 годзе ён паступае на гістарычны факультэт Кіраўскага педагагічнага інстытута, які закончыў з адзнакай. Адначасова вучыўся на завочным аддзяленні філасофскага факультэта МДУ імя М. В. Ламаносава.

У час вучобы ў інстытуце М. І. Рубцоў стаў камуністам. Атрымаўшы вышэйшую адукацыю, Мікалай Іванавіч працуе выкладчыкам гісторыі ў сярэдняй школе, а затым паступае ў аспірантуру пры філасофскім факультэце МДУ.

З 1957 года пачынаецца навукова-педагагічная работа будучага вучонага. Спачатку ён — старшы выкладчык кафедры філасофіі Кіраўскага педінстытута, а пасля абароны ў 1962 годзе кандыдацкай дысертацыі — дацэнт гэтай жа кафедры. У чэрвені 1972 года Мікалай Іванавіч абараніў доктарскую дысертацыю «Суадносіны свабоды і неабходнасці ў грамадскім развіцці». З гэтага моманту яго навуковая і педагагічная дзейнасць стала яшчэ больш актыўнай.

Прафесар М. І. Рубцоў — аўтар ужо больш дваццаці навуковых прац, сярод якіх фундаментальная манаграфія, шэраг артыкулаў у калектыўных публікацыях, выдадзеных у Маскве і Ленінградзе. Яго навуковыя работы вызначаюцца высокай ідэйнасцю, глыбінёй аналізу, нязменным захаваннем марксісцка-ленінскіх прынцыпаў, канкрэтнага гістарызму і партыйнасці.

У нашым універсітэце Мікалай Іванавіч працуе дзесяты год, вядзе актыўную навукова-педагагічную, выхаваўчую і грамадскую работу. Ён з'яўляецца членам вучонага Савета па грамадскіх навуках ГДУ, членам Савета эканамічнага факультэта, членам метадычнага Савета абкома КПБ, кіраўніком тэарэтычнага семінара кафедры філасофіі.

Аўтарытэт вучонага М. І. Рубцова даволі высокі. Сведчаннем гэтага з'яўляецца той факт, што на працягу многіх гадоў Мікалай Іванавіч выступае ў якасці навуковага кансультанта ўсесаюзнага часопіса «Научный коммунизм».

Любоў да сваёй справы, высокі прафесіяналізм забяспечылі М. І. Рубцову вялікую павагу калег і студэнтаў, усіх тых, з кім ён шчодра дзеліць свае багатыя веды. З нагоды яго юбілею яны ад усёй душы жадаюць яму яшчэ многіх гадоў творчай працы, вялікіх поспехаў у навуцы, у навучанні і выхаванні высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі краіны!

**В. НАВАЖЫЛАЎ, партгрупорг кафедры філасофіі.**

# ЎКРАІНСКАЯ ЗЯМЛЯ

Галоўны корпус універсітэта размяшчаецца ў адным з прыгажэйшых будынкаў горада — былой рэзідэнцыі букавінскіх мітрапалітаў. Гэты архітэктурны помнік XIX стагоддзя ўразіў нас сваёй прыгажосцю і веліччу. Ён узведзены ў 1864 — 1882 г. г. па пректу і пад кіраўніцтвам вядомага чэшскага архітэктара І. Глаўкі. Рознакаляровая чарапіца даху ўтварае прыгожы узор, які нагадвае малюнак народных букавінскіх дываноў.

Гордасць універсітэта — яго Мармуровая зала. Яна ўпрыгожана каштоўнымі пародамі дрэў, бронзай і рознакаляровым мармурам, распісана венскімі і букавінскімі майстрамі. Разная дубовая столь Мармуровай залы падтрымліваецца 12 калонамі, а сцены — упрыгожаны залатымі фрэскамі. Побач з ёй — Чырвоная зала. Пры яе аздабленні выкарыстаны нацыянальны арнамент. У гэтай зале засядае Вучоны савет універсітэта, уручаюцца дыпломы выпускнікам. Тут жа праходзіла ўрачыстае адкрыццё і закрыццё фестывалю інтэрклубаў.

...У шырокай даліне, дзе бурны Чарамош вырываецца з палону крутых узгоркаў, запавольвае свой бег і нясе свае воды да р. Прут, раскінуўся гарадок Віжніца. Ён ляжыць каля самага падножжа Букавінскіх Карпат. Віжніцу так і называюць: вароты ў Карпаты. Тут пачалося адно з самых захапляючых падарожжаў удзельнікаў фестывалю да цудоўнага помніка прыроды — урочышча Працятыя Камені. Каменныя волаты ўражваюць непрыступнасцю адвесных сцен, якія не ўступаюць па вышыні шматпавярховым дамам, здзіўляюць мудрагелістымі контурамі і формамі. На такое здатна толькі фантазія прыроды.

Мы пабывалі таксама каля скал пячоры Доўбуша, у іншых цікавых куточках Букавінскіх Карпат.

Хутка праляцелі дні фестывалю. Шкада было развітвацца з сябрамі. Не верылася, што больш не збяромся разам, каб паслухаць песні ў выкананні нашай Марыны Шырынкінай, якія так спадабаліся ўсім за гэтыя дні, што не будзем больш смяяцца з басень, што чытаў на ўкраінскай мове Пеця Галаўко. Дзвюма граматамі была ўзнагароджана наша дэлегацыя: за актыўны ўдзел у праграме інтэрзлёта і за выступленне на вечары патрыятычнай песні.

Уручаны памятныя падарункі, закончыўся развітальны вечар. Мы раз'язджаліся і везлі з сабой новыя адрасы сяброў — з Цалінаграда і Чарнаўцоў, Волагды і Сумаў, Бельцаў і Махачкалы.

**Таццяна ДАЎГУН, студэнтка гістфіла, член КІДА «Саюз».**

# У СУЗОР'І БРАТНІХ ЛІТАРАТУР

Як да вялікага свята рыхтуюцца да 60-годдзя СССР усе савецкія людзі.

У мастацкі летапіс жыцця народаў нашай краіны вялікі ўклад уносяць і пісьменнікі літаратур народаў СССР, якая выдаецца сёння на 77 мовах. Аб гэтым ішла шырокая гаворка на студэнцкай навуковай канферэнцыі «Братэрства народаў — братэрства літаратур», якую правяла 14 снежня ў актавай зале ГДУ кафедра беларускай літаратуры.

З уступным дакладам аб праблемах развіцця шматнацыянальнай савецкай літаратуры, аб новых здабытках паэтаў і пісьменнікаў выступіла в. а. загадчыка кафедры, дацэнт В. І. Смыкоўская.

Пра жыццёвы і творчы шлях найбольш яркіх прадстаўнікоў нацыянальных літаратур гаварылі ў сваіх дакладах студэнты пятага курса гісторыка-філалагічнага факультэта. Цікавы і змястоўны даклад аб творчасці слаўнай дачкі ўкраінскага народа Лесі Украінкі зрабіла Л. Новікава. Пра паэта-інтэрнацыяналіста Мусу Джаліля расказала С. Радкевіч. З творчасцю летапісца жыцця Украіны і яго народа Алеся Ганчара пазнаёміла ўдзельнікаў канферэнцыі Л. Гайдукова. Арыгінальныя і цікавыя назіранні зроблены ёю пры аналізе рамана «Твая зара», які адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР 1982 года.

«Гуманістычны пафас паэзіі Э. Межэлайціса» — тэма даклада Л. Мяжэвіч. Народны паэт Літвы, лаурэат Ленінскай прэміі паўстаў перад удзельнікамі канферэнцыі як пясняр дружбы народаў, паэт-інтэрнацыяналіст. Лагічным працягам гэтай тэмы з'явіўся навуковы даклад І. Пагоньшавай пра народнага паэта Дагестана Р. Гамзатава, чалавека, якому аднолькава блізкімі сталі і горы Дагестана і зямля Беларусі з яе гасцінным працалюбівым беларускім народам, шчодрымі і пяшчотнымі жанчынамі Белай Русі.

Заключным акордам прагучалі на канферэнцыі вершы народаў СССР у выкананні Л. Казанцавай і В. Бандарэнка.

У навуковай канферэнцыі прынялі ўдзел і супрацоўнікі бібліятэкі гістфіла. З іх дапамогай (арганізатар Н. П. Капшай) была падрыхтавана тэматычная выстаўка «У сям'і братніх літаратур».

**Л. КНІГА, студэнтка 5-га курса гісторыка-філагічнага факультэта.**

*Інтэрнат — твой дом*

# ТУТ НАМ ЖЫЦЬ

...Акуратныя, чыстыя калідоры; светлыя, упрыгожаныя кветкамі холы; на дзвярах кожнага пакоя пад шклом — спіс жыхароў — такі «твар» інтэрната № 2, што па вуліцы Кірава. У гэтым годзе яго гаспадарамі сталі студэнты матэматычнага факультэта.

У інтэрнаце створаны добрыя ўмовы для падрыхтоўкі студэнтаў да заняткаў, семінараў, калёквіумаў. У іх распараджэнні — прасторная чытальная зала, у якой нядаўна з'явілася новая мэбля.

Сур'ёзную ўвагу і камендант інтэрната Л. І. Рашкевіч, і студэнцкі прафком універсітэта, і дэканат матфака ўдзяляюць паляпшэнню бытавых умоў студэнтаў. У інтэрнаце працуюць душавыя, пакоі для мыцця і прасавання, штодзённа адкрыт буфет, па ўстаноўленаму графіку працуе стол раскрою адзення. Каб палепшыць санітарна-бытавы стан інтэрната, па ініцыятыве студсавета праведзены два суботнікі.

Сур'ёзна падыходзіць студэнцкі савет да арганізацыі вольнага часу студэнтаў, што жывуць у інтэрнаце. Складзен прыкладны план работы, у якім прадугледжаны розныя цікавыя мерапрыемствы: сустрэчы, гутаркі, «Агеньчыкі», вечары адпачынку. У выхадныя і святочныя дні жадаючыя могуць наведаць дыскатэку, паслухаць любімыя мелодыі, патанцаваць.

Арганізацыя вольнага часу студэнтаў — толькі частка выхаваўчай работы, якая праводзіцца ў інтэрнаце. Вядома, што шмат пазавучэбнага часу студэнты праводзяць у сваім доме. Таму дэканат, партыйная арганізацыя матэматычнага факультэта, улічваючы гэта, распрацавалі комплексны план правядзення выхаваўчай работы ў інтэрнаце, разлічаны на ўвесь навучальны год. У гэты план, акрамя арганізацыйных мерапрыемстваў, уключаны такія напрамкі работы як ідэйна-палітычнае і маральна-эстэтычнае выхаванне, культурна-масавая і спартыўная работа. У якасці асобных раздзелаў запланаваны мерапрыемствы, правесці якія намячаюць кафедры факультэта. У плане ёсць і такі важны пункт, як разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва на лепшы пакой інтэрната, прысвечанае 60-годдзю ўтварэння СССР. Цяпер гэта спаборніцтва праходзіць пад дэвізам: «Інтэрнат — твой дом. Зрабі яго ўзорным!». Вынікі асвятляюцца ў насценнай газеце інтэрната, а пытанні, якія датычаць арганізацыі спаборніцтва, рэгулярна разглядаюцца на пасяджэннях студсавета. Вынікі яго будуць падведзены да дня слаўнага юбілею нашай Радзімы. Да гэтай жа даты плануецца значна абнавіць наглядную агітацыю ў холах, ленінскім пакоі.

Цікавы напрамак у выхаваўчай рабоце ў інтэрнаце — правядзенне дзён кафедр. Зараз, у прыватнасці, праходзяць дні кафедры алгебры і геаметрыі. У праграме — шмат цікавых мерапрыемстваў, прычым, гэта не толькі лекцыі або гутаркі. Так, нядаўна, адбыўся матч па міні-футболу паміж супрацоўнікамі кафедры і студэнтамі. Перамаглі апошнія. А на днях з вялікім поспехам пад рубрыкай «60-годдзю СССР прысвячаецца» праведзены вечар савецкай паэзіі. Яго арганізавалі і прынялі ў ім самы актыўны ўдзел дацэнт кафедры алгебры і геаметрыі, сакратар партбюро факультэта Л. Я. Палякоў і загадчык кафедры тэорыі верагоднасці і матэматычнай статыстыкі Ю. У. Малінкоўскі. Выкладчыкі, якіх студэнты прывыклі бачыць у якасці лектараў каля дошкі, строгіх і патрабавальных настаўнікаў, — чыталі вершы, ігралі на гітары, спявалі песні на вершы любімых савецкіх паэтаў. Такое памятаецца доўга!

Зразумела, што такія вось формы работы ў інтэрнаце, мерапрыемствы, якія праводзяцца жыва, цікава, з агеньчыкам, падабаюцца студэнтам.

...Набліжаецца зімовая сесія. З кожным днём усё больш сур'ёзных, заклапочаных студэнтаў, якія схіліліся над падручнікамі і канспектамі ў чытальнай зале інтэрната. У перыяд сесіі тут з мэтай паляпшэння падрыхтоўкі студэнтаў да экзаменаў арганізуюцца кансультацыі выкладчыкаў, а таксама студэнтаў-выдатнікаў.

Так жыве вясёлы, добры наш дом — студэнцкі інтэрнат матфака.

**С. БАДРУНОЎ,**
**старшы куратар інтэрната № 2.**



Шматлікія і самыя разнастайныя экспанаты, якія сабраны ў заалагічным музеі універсітэта, выклікаюць цікавасць ва ўсіх яго наведвальнікаў, у кожнага, хто любіць прыроду — і студэнтаў, і школьнікаў.

На здымку: заалагічны музей ГДУ.

Фота У. Чысціка.

*Археалагічная практыка*

# ДНІ ЦІКАВЫХ ПОШУКАЎ

**(Заканчэнне. Пачатак у № 35)**

**Дзень дзесяты.** З самай раніцы, нягледзячы на цудоўнае надвор'е, нам не шанцавала. Броўка аднаго з квадратаў дасягнула крытычнай вышыні, падсохла пад сонцам і — абсыпалася. А яшчэ — паехалі нашы новыя знаёмыя: супрацоўнікі абласнога краязнаўчага музея А. Макушнікаў, Т. і В. Літвінавы. Але ўсе члены экспедыцыі стараліся «не падаць духам», падтрымліваць бадзёры настрой. І зноў вечарам гарэў касцёр. Рабяты сядзелі каля яго, размаўлялі аб будучым. Якое яно будзе?

**Дзень дванаццаты.** Сёння — выхадны, да таго ж незвычайны. У нас прайшло гумарыстычнае свята «Мілаградцы і мы», у ходзе якога члены экспедыцыі інсцэніравалі жыццё племені мілаградскай культуры.

**Дзень пятнаццаты.** Адбылася важная для экспедыцыі падзея — закончаны першыя раскопкі гарадзішча. Здавалася, з самай раніцы нават сонейка свяціла ярчэй, каб дапамагчы нам хутчэй справіцца з работай. Заканчваліся даследаванні, у час якіх мы, будучыя гісторыкі, упершыню дакрануліся да зямлі, якая доўгія гады захоўвала нязведанае.

Дзень прайшоў у добрым працоўным рытме. Нехта спрачаўся аб дакладнасці арыентыроўкі, нехта спяшаўся да заходу сонца зачысціць броўку, некаму абавязкова хацелася высветліць паходжанне вугальнага пласта. Толькі тады, калі ўсё гэта было зроблена, рабяты ўсвядомілі, што, вось ён, канец раскопкам гарадзішча. С. Я. Расадзін выступіў з невялічкай прамовай, С. Дранец кінуў сімвалічную апошнюю лапату зямлі.

Вечарам усе прыйшлі на гарадзішча і, седзячы каля кастра, думалі аб тым, што іх рукі перабралі тут не адну тону зямлі, знайшлі шмат прадметаў, якія ўяўляюць вялікую цікавасць не толькі для археолагаў.

**Дзень дзевятнаццаты.** Цяпер работа нашай экспедыцыі працягваецца на раскопках курганнай групы — гістарычных помнікаў эпохі Кіеўскай Русі. Тут мы таксама знайшлі шмат цікавага.

**Дзень дваццаты, апошні.** Раскапаны яшчэ два курганы. Знойдзеныя ў іх рэчы зацікавілі не толькі нас саміх, але і мясцовых жыхароў.

На развітанне ўдзельнікамі экспедыцыі было сказана многа цёплых слоў аб праведзеных разам днях.

**У. У. БАГАМОЛЬНІКАЎ, навуковы кіраўнік экспедыцыі «Нісімкавічы-82», асістэнт кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі:**

— Закончыўся яшчэ адзін палявы сезон. Наперадзе ў кожнага — сваё жыццё, свая сцяжынка ў навуцы. А гэта археалагічная практыка назаўсёды застанецца ў памяці ўсіх яе ўдзельнікаў.

**Т. і В. ЛІТВІНАВЫ, навуковыя супрацоўнікі Гомельскага абласнога краязнаўчага музея:**

— Ёсць такі старажытны выраз: «Жыццё — дарога». Гэта сапраўды так. У кожнага свая дарога, і кожны на ёй нешта знаходзіць, нешта пакідае. Чалавек ідзе па сваёй дарозе і ў дождж, і ў спякоту, і ў вецер. Ён усё жыццё шукае, інакш жыццё страціць для яго сэнс. І як прыемна сустракаць на нялёгкім шляху пошукаў добрых і сумленных людзей, мужных і вясёлых. Як прыемна сагрэцца каля іх кастра ў непагадзь, выпіць кубак халоднай вады з іх рук у спякотны дзень, проста пачуць добрыя словы. Дык давайце, кім бы мы ні сталі, дзяліцца апошнім з сустрэчным чалавекам. Такімі былі для нас рабяты — студэнты гістарычнага аддзялення ГДУ ў час раскопак.

**А. МАКУШНІКАЎ, навуковы супрацоўнік абласнога краязнаўчага музея, выпускнік ГДУ:**

— Шкада, што я — не паэт. Такая навокал прырода! Студэнты — брація землякопская — малайцы! Вязу з раскопак не толькі чамадан бітых чарапкоў, але і цеплыню сустрэч з новымі сябрамі.

А вось уражанні саміх студэнтаў-практыкантаў.

**І. ФЕДАРАВА.** — Кожны з нас будзе памятаць малочныя туманы, дым кастра. А самае важнае — мы набылі тут галоўнае — дружбу. Дзякуй археолагам за цікавыя расказы, перададзеныя нам навыкі і веды.

**Н. САЛОДКІНА.** — Для мяне галоўнае — калектыў. А ён атрымаўся выдатны! Лепшыя рысы характару кожнага праявіліся менавіта тут, у час экспедыцыі.

* * *

Экспедыцыя «Нісімкавічы-82» завершана, адышла ў гісторыю палявых археалагічных даследаванняў, якія арганізоўвае кожнае лета наш універсітэт. Падводзяцца вынікі археалагічнай практыкі студэнтаў, матэрыялы экспедыцыі апрацоўваюцца на факультэце і ў АН БССР, новымі знаходкамі папоўніліся фонды абласнога краязнаўчага музея. Але не толькі навуковыя вынікі атрыманы ў ходзе работы. Адзін з галоўных набыткаў, і гэта падкрэслівалі ўсе ўдзельнікі экспедыцыі, — дружба, калектывізм, адказныя адносіны да справы.

Члены невялічкага калектыву жылі згуртавана, цікава. Гэта адбілася і на выніках работы, і нават на такіх падзеях, як урачысты спуск флага ў канцы дня (гэта права прадастаўляецца лепшаму «археолагу», у час гумарыстычнага свята «Мілаградцы і мы»). А самы галоўны вынік — гэта далучэнне студэнтаў да археалогіі. Па-сутнасці, яны цэлы месяц знаходзіліся на пярэднім рубяжы гістарычнай навукі ранніх перыядаў, на той грані ў даследаваннях, якая раздзяляе вывучанае і яшчэ нязведанае. Гэта нязведанае, прайшоўшы праз рукі будучых гісторыкаў, будзе цяпер ісці ад этапа да этапа ў сваім вывучэнні, аналізавацца і, ўрэшце рэшт, увальецца ў стройную сістэму гістарычных ведаў.

Даследаванні, што вялі студэнты-практыканты мінулым летам у в. Нісімкавічы, будуць працягвацца. І не адзін раз першакурснікі гістарычнага аддзялення раскінуць свой палатачны гарадок каля комплексу археалагічных помнікаў, з нецярплівасцю будуць чакаць часу, калі можна будзе ўзяцца за рыдлёўкі, каб зрабіць першы адвал і паглядзець на зямлю вачыма археолага. Застаецца пажадаць будучым даследчыкам поспехаў.

**Студэнты групы Г-21 гісторыка-філалагічнага факультэта, удзельнікі археалагічнай практыкі.**

## СПОРТ

## «СЕРАБРО» А. КАЗОЎСКАГА

У г. Гродна адбыўся ўсесаюзны чэмпіянат па класічнай барацьбе членаў спорттаварыстваў прафсаюзаў. Тытулы мацнейшых аспрэчвалі 200 атлетаў. Сярод іх быў і студэнт факультэта фізвыхавання універсітэта Аляксандр Казоўскі. На гэты раз ён выступаў у новай для сябе, больш цяжкай вагавай катэгорыі — да 82 кг. У ёй было заяўлена 19 барцоў, у ліку якіх — 15 майстроў спорту. Аляксандр паспяхова правёў усе паядынкі і ўпэўнена дайшоў да фінальнай сустрэчы. Яго апошнім сапернікам за вышэйшую ўзнагароду быў масквіч Андрэй Бычкоў. Здавалася, што наш атлет акажацца мацнейшым і на гэты раз. Аднак у канцы паядынка ён некалькі расслабіўся і прайграў заключную сустрэчу па балах. У выніку — сярэбраны медаль чэмпіяната ВЦСПС.

## ПАСПЯХОВЫ ФІНІШ

Закончылася круглагадовая спартакіяда Белсавета СДСТ «Буравеснік» 1982 года. На заключным этапе паспяхова выступіла юніёрская каманда нашага універсітэта па класічнай барацьбе. Па групе ВНУ рэспублікі яна заняла першае месца, па групе абласных саветаў студэнцкага таварыства — другое. У асабістым заліку чэмпіёнамі сталі майстры спорту першакурснік факультэта фізвыхавання Г. Казараў і студэнт другога курса геалагічнага факультэта А. Сафонаў.

**В. СІСЬКОЎ,**
**старшыня спортклуба ГДУ.**

## З ПЕРАВАГАЙ У АЧКО

На гэтым тыдні завяршыўся шахматны турнір студэнтаў, які праводзіўся па праграме круглагадовай універсіяды. Самым захапляючым стаў паядынак шахматыстаў фізічнага і эканамічнага факультэтаў. Ад яго вырашаўся агульнакамандны вынік. На кожнай дошцы вялася напружаная барацьба за перамогу. Аднак канчатковы вынік усіх сустрэч аказаўся нічыйным — 2,5:2,5. Але так як будучыя фізікі перамаглі папярэдніх сваіх супернікаў больш пераканаўча, чым эканамісты, то яны і выйшлі на першае месца. Другі радок у турнірнай табліцы, адстаўшы на адно ачко, занялі эканамісты. Трэцімі прызёрамі першынства універсітэта сталі матэматыкі.

Здзіўляе, што на геалагічным факультэце і факультэце фізвыхавання не змаглі выставіць каманды па гэтаму папулярнаму віду спорту.

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ и профкомов Гомельского государственного университета (на белорусском языке), Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 2 друк. аркуш. Тыраж 2000 экз.
Наш адрас: вул. Савецкая, 104, п 3-11, т. 56-16-52.
АЗ 20771 Заказ 7089